НЯДЗЕЛЯ, 26 ВЕРАСНЯ

ПЕРШЫ

8.15 М/ф.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 «Арсенал».
9.35 «Зброя».
9.50 Альманах падарожжаў.
10.20 Культурныя людзі.
10.55 «Невядомая версія. «Экіпаж».
12.10 Фільм-катастрофа «Экіпаж».
14.45 Актуальнае інтэрв'ю.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 «Лічбавыя наркотыкі».
15.55 Маст. фільм «Хільдэгардэ».
17.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэазачасопіс.
18.05 Суперлато.
19.20 «Мая праўда». «Наталля Мядзведзева. Антызорка».
20.30 «Спортлато 5 з 36».
20.55 «КЕНО».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.25 Камедыя «Любоўны менеджмент».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь.
9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Ранішняя пошта».
12.25 Камедыя «Ты — мне, я — табе».
14.00 «Брэйн-рынг».
15.00, 16.20 «Вялікая розніца» ў Адэсе.
16.15 Навіны спорту.
16.50 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Дынама-Мінск» — «Вальядалід».
18.40 «Бітва тытанаў».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.40 «Лёд і полымя».
0.40 «YESTERDAY LIVE».

ЛАД

6.55 Звон.
7.25 Мір вашаму дому.
7.35 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.00 Нашы тэсты.
9.10 Жаночая ліга.
9.40 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
10.20 Школа рамонту.
11.35 Тэлебарометр.
11.40 «Правы чалавека».
11.50 Гаспадар.
12.25 Маст. фільм «Асцярожна, дзеці».
13.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Болтан—Манчэстэр Юнайтэд.
16.00 Серыял «Непрыгожая Бэці-2».
16.55 «Неверагодныя гісторыі кахання».
17.55 Меладрама «Артыстка».
19.50 Смешная часінка.
20.30 Тэлебарометр.
20.50 Баявік «Шаравая маланка».
23.15 Культасвет.

СТБ

7.00 Серыял «Вовачка-2».
7.55 Маст. фільм «Красуні».
9.30, 19.00 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікае сненданне».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Дарагая перадача».
14.00 Маст. фільм «Кур'ер».
15.40 «Лёс».
16.30 «24 гадзіны».
16.55 Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «БАТЭ» — ФК «Мінск».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Каралі вуліц».
22.40 Жывы канцэрт. Пераможцы «Зорнага рынга» — група «Без Білета».
23.35 Маст. фільм «4 месяцы, 3 тыдні і 2 дні».
1.35 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

МІР

5.00, 12.40 Серыял «Камісар Мегрэ».
5.50 Простыя лічбы.
6.20, 3.50 Дак. фільм «Забыты насарог».
7.30 М/с «Тры мядзведзі».
8.00 Серыял «Прыгоды швейцарскай сям'і Робінсанаў».
8.30 «АБВГДэйка».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Ведаем рускую».
10.10 «Ахвота да змены месцаў».
10.40 «Любімыя акцёры».
10.50, 2.25 Маст. фільм «Прыгонная актрыса».
13.40, 23.35 «Доказы віны».
14.30 «Дыяспары».
15.10, 21.40 Маст. фільм «Пасарамі д'ябла».
17.00 Дак. фільм «Архівы да Вінчы».
18.10, 0.25 Маст. фільм «Хардбол».
20.00 «Разам».
21.00 «Паўночнікі».

8 КАНАЛ

9.00, 13.10, 17.55, 18.55, 21.10, 23.35 «Надвор'е».
9.05 «Пляткарка».
9.15 «Мой любімы гадаванец».
9.45 «Мультпарад».
9.55, 23.15 «Кінаблакнот».
10.15 «Адшукваецца адпачынак».
10.45 Трылер «Прафесіянал».
13.15 «Яна напісала забойства».
15.00 «К-відэа» для дзяцей.
15.20 Фільм для дзяцей «Дрыжы вусаты».
16.30 Серыял «Гром у раі».
17.30 «Бульбокс».
18.00 Серыял «Абаронца».
19.00 Трылер «Братэрства каменя».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.15 Камедыя «Я застаюся».

ВТБ

6.00, 23.00 «PLAY».
10.30 Тэлесерыял «6 кадраў».
13.00 Серыял «Ранеткі».
15.00 Камедыя «Кацёся!».
17.30 Скетч-шоу «Татавы дочкі».
20.00 Камедыя «Марская прыгода».
22.00 Скетч-шоу «6 кадраў».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Мая планета».
7.30 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
8.20 Маст. фільм «Піцерскія канікулы».
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.10 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 Маст. фільм «Сёе-тое з губернскага жыцця».
14.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
14.45 Дак. фільм «Масква, якую мы страцілі».
15.40 Маст. фільм «Прывітанне з фронту».
17.15 Святочны канцэрт.
20.00 «Гарадок».
20.30 Камедыя «Вялікае каханне».
22.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
23.40 Маст. фільм «З Дона выдачы няма».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.30 М/ф.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.45 «Іх норавы».
9.20 «Ядзім дома!».
10.20 «Першая перадача».
10.55 «Спетае ў СССР». «Чорны кот».
11.55 «Дачны адказ».
13.25 «Лепшы горад Зямлі». Масква перабудоўчая.
14.20 «Суд прысяжных: Галоўная справа».
16.25 «Развод па-руску. Тайны грамхарчу».
17.25 «І зноў прывітанне!».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.50 «Цэнтральнае тэлебачанне».
22.05 Серыял «Дарожны патруль».
23.55 «Асабліва небяспечны!».
0.30 «Футбольная ноч».
1.00 «Нерэальная палітыка».

ТНТ

5.00 М/с «Сапраўдныя монстры».
6.00 М/с «Котасабака».
7.25 Серыял «Сябры».
8.50 Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00 «Школа рамонту».
10.00, 3.40 «Бітва экстрасэнсаў».
11.00 «СуперІнтуіцыя».
12.00 Баявік «Тры каралі».
14.00 «Інтэрны». Сітком.
16.00 Меладрама «Марлі і я».
18.30, 21.30 «Comedy Батл».
19.00 Трылер «Здзелка з д'яблам».
20.50 «Наша Russia».
22.00, 1.00 «Дом-2».
23.30 «Comedy Woman».
0.25 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
1.55 Камедыя «Апошняя просьба».
4.45 «Камедыянты».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
9.40 Маст. фільм «Трыццаць тры».
11.00 «Легенды сусветнага кіно». Ромі Шнайдэр.
11.25 «Сусветныя скарбы культуры».
11.45 М/ф «Тайна трэцяй планеты».
12.35, 0.55 Дак. фільм «Пінгвіны. Гісторыя пра птушак, якім захацелася стаць рыбамі».
13.25 «Што рабіць?».
14.15 «Пісьмы з правінцыі».
14.40 Маст. фільм «Дзямідавы».
17.10 Балет «Жызэль».
19.05 Маст. фільм «Чорны манах».
20.40 «Песні сапраўдных мужчын». Канцэрт-прысвячэнне Юрыю Візбару.
21.55 Маст. фільм «Чырвоная пустыня».
0.05 «Джэм-5». «Йелоу Джэкетс».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Сяргей Бандарчук». Дак. фільм.
6.00 «Дзякуй за нялётнае надвор'е». Фільм-канцэрт. 1981 год.
6.55 «Паехаць... Застацца...». Дак. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Кінапанарама» 1982 год.
11.00 «Да і пасля...». Год 1959.
12.15 «Абед». Дак. фільм.
12.35 «КВЗ». Сезон 1986—77 гг.
15.00, 21.00 «Журналіст». Маст. фільм.
17.00 «Акулы пяра».
17.55 «Блакітны агеньчык». 1966 год.
18.50 «Ранішняя пошта».
19.25 «Марафон Алега Басілашвілі». 1994 год.
20.00 «Быў час».
23.00 «Музычны кіёск». 1988 год.
23.30 «Клуб падарожнікаў». 1980 год.
0.30 М/с «Чараўнік Ізумруднага горада».
0.50 «Шафёр на адзін рэйс». Маст. фільм.
4.00 «Тэма». 1993 год.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Кінааповесць «Сёння або ніколі».
8.30, 14.30 Дэтэктыў «Казіно».
10.30, 16.30 Трагікамедыя «Адзін у адзін».
18.30, 0.30 Трагікамедыя «Старэйшы сын».
20.45, 2.45 Камедыя «Дванаццатая ноч».
22.30, 4.30 Кінааповесць «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00 Серыял «Лясун. Працяг гісторыі».
3.55 Маст. фільм «Код Апакаліпсісу».
5.40 Камедыя «Дванаццаць крэслаў».
8.15 Дэтэктыў «У паласе прыбою».
9.40 Меладрама «Не баліць галава ў дзятла».
11.55 Маст. фільм «Яны ваявалі за Радзіму».
14.30 Маст. фільм «Відрымасгор, або Гісторыя майго космасу».
15.50 Маст. фільм «Яшчэ раз пра каханне».
17.25 Дэтэктыў «Загадка Эндхаўза».
19.00 Серыял «Лясун. Працяг гісторыі», заключная серыя.
20.00 Маст. фільм «Снягір».
21.30 Маст. фільм «Формула кахання».
23.00 Маст. фільм «Вертыкаль».
0.15 Трылер «Чалавек, які браў інтэрв'ю».
1.45 Камедыя «Жывіце ў радасці».

ТБ1000

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Уменне жыць у Адэсе».
10.50, 18.50, 2.50 Меладрама «Рэальнае каханне».
13.10, 21.10, 5.10 Драма «Домбі і сын».
14.55, 22.55, 6.55 Драма «Любоўная ліхаманка».

ТБ3

3.00, 21.00 Камедыя «Казанова».
5.00 Камедыя «Перамотка».
7.00 Камедыя «Цыпачка».
9.00 Камедыя «Пенелопа».
11.00 Камедыя «Жыві свабодна або памры».
13.00 Камедыя «Прынцэса лёду».
15.00 Драма «Эвелін».
17.00 Камедыя «Пялёсткі надзеі».
19.00 Камедыя «Непрыбраныя пасцелі».
23.00 Драма «Студыя 54».
1.00 Меладрама «Бяссмерце».

ТБ-21

5.00 М/ф «Сільвестр і Твіці».
5.30 М/ф «Том і Джэры. Дзіцячыя гады».
6.00 «Далёка і яшчэ далей».
7.00 М/ф.
7.45 Маст. фільм «Трукач».
10.30, 2.00 «Трэцяя планета ад Сонца». Серыял.
11.00, 2.30 «Усе мае былыя». Серыял.
12.00 Дак. серыял «Містычная планета».
13.00 «Якая размаўляе з прывідамі». Серыял.
15.00 Дак. фільм «Тайныя сховішчы».
17.00 Дак. фільм «Не такія».
18.00 Маст. фільм «Кропка падзення — Берлін».
20.00 Маст. фільм «Драпежнік-2».
22.00 «Сховішча». Серыял.
23.00 «Псі-фактар». Серыял.
0.00 Маст. фільм «Трохвугольнік».
3.30 Маст. фільм «Бярмудскі трохвугольнік — пад вадой».

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40 «Кругасветнае падарожжа».
7.55 «Паслухай, красуня».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне+».
13.20 «Без вестак зніклая».
19.35, 0.55 «Анучная лялька».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Я лічу: раз, два, тры, чатыры, пяць...».
0.00 «Неўтаймоўная Хільда».
2.40 «Дзеля кахання Глорыі».

DIVA UNIVERSAL

0.30 «У звязцы». Маст. фільм.
2.00 «Таямнічая жанчына: Збавенне». Маст. фільм.
3.30 «Тое, чаго не бачыць вока». Маст. фільм.
5.00 «Дочкі Маклеода-VII». Серыял.
7.30 «Джордан расследуе». Серыял.
8.20 «Сапраўдныя хатнія гаспадыні округі Орындж». Серыял.
10.00 «Дамы сям'і Гілмор». Серыял.
11.40 «Шэная». Маст. фільм.
13.20 «Абязлічаная». Маст. фільм.
15.00 «Дзяўчына-сіноптык». Маст. фільм.
16.40 «Пляткарка». Серыял.
18.25 «Рэстаранны раман». Маст. фільм.
20.00 «Копы-навабранцы». Серыял.
20.50 «Добрая жонка». Серыял.
21.40 «Шпік». Серыял.

SY FY

7.30 Зачараваныя.
11.40 «Ядавітае неба». Драма.
13.20, 23.10 Прытворшчык.
15.00 Доктар Хто.
16.40 Легенда пра Шукальніка.
18.20 Пункт прызначэння — праўда.
20.00 «Горш не бывае». Драма.
21.35 «Індыга». Драма.
1.40 Кароткаметражныя фільмы.

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00 Камедыя «Прыгоды Пятрова і Васечкіна звычайныя і неверагодныя».
6.10, 10.10, 14.10 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Канёк-Гарбунок».
8.15, 12.15 Казкі замежных пісьменнікаў. «Прыгоды барона Мюнхгаўзена»; зборнік м/ф: «Чарадзейная палачка», «Усмешка Леанарда да Вінчы».
13.00, 15.00 Маст. фільм «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна».
16.05 М/с «Маўглі». «Вяртанне да людзей»; зборнік м/ф: «Гора не бяда», «Клетка», «Пустамеля».
17.00 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Прыгоды Бураціна».
18.05 Казкі Пушкіна. «Казка пра папа і пра работніка яго Балду»; зборнік м/ф: «Апошняе паляванне», «Шчаслівы Рыгор».

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Нетрадыцыйная медыцына.
5.30, 20.30 Практыка здароўя.
6.00, 21.00 Гісторыя хваробаў.
6.30, 21.30 Хто старэе хутчэй?
7.00, 22.00 Пра дыеты і не толькі.
7.30, 22.30 Найноўшыя дасягненні.
8.00, 23.00 Як не страціць здароўе.
8.30, 23.30 Пазнай сябе.
9.00, 0.00 Правілы здароўя.
9.25, 0.30 Я расту.
9.55, 14.05, 17.00, 1.05 Як пражыць даўжэй.
10.55, 2.00 Набалелае пытанне.
11.35, 2.40 Выдаткі вытворчасці.
12.05, 3.10 Энцыклапедыя памылак.
12.20, 3.25 Цела чалавека.
12.50, 16.55, 18.55, 1.00, 3.55 Азбука здароўя.
12.55, 4.00 Кабінет прыгажосці.
13.35, 4.30 Школа розуму.
14.05 Як пражыць даўжэй.
14.55 Цяга да жыцця.
15.35 Будзем здаровыя.
16.05 Уся праўда пра ежу.
17.50 Памылкі здароўя.
18.25 Увага, ежа!
19.00 Зялёная аптэка.
19.30 Жыццё або Смерць?

ТДК

6.00, 7.50, 10.50, 11.50, 13.00, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.30 Усё лепшае, для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
11.00, 13.25, 2.00 Нашы дзеці.
15.30 Латарэя «Бінга».
15.55, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00, 22.30 Люстэрка жыцця.
21.00, 23.30 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.
4.00 Твой дом.

DISCOVERY

7.00, 4.45 «Як гэта працуе».
7.55, 15.15, 3.50 Новы свет.
8.50, 14.20, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Маланкавыя катастрофы».
10.40 Амерыканскія лесарубы.
11.35 Выжыць любой цаной.
12.30 Буянства тарнада.
13.25 Смяротны ўлоў.
16.10 Скрыўленне часу.
16.35 «Top Gear».
18.30 Заводскія будні.
19.00 «Пятая перадача».
20.00 Круты цюнінг.
22.00 Рос Кемп.
23.00 У турме і на чужыне.
0.00 Твар у твар са смерцю.
1.00 «На месцы злачынства».
2.00 Нацыя, якая адпачывае.
5.10 Будаўнічая дапамога.
6.05 «Дзёрзкія праекты».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 У аб'ектыве.
6.00 Школа палявання для касатак.
7.00 Гепарды.
8.00 Створаныя забіваць.
9.00 Некранутая прырода.
10.00 Малпы-зладзюжкі
11.00 Мегазаводы.
12.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
13.00 Некранутая прырода.
14.00 Паляванне на паляўнічага.
15.00 Толькі не расказвайце маме, што я...
16.00 Небяспечныя падарожжы.
17.00 Дэтэктывы-дайверы.
18.00 Мегазаводы.
19.00, 4.00 Расследаванні авіякатастроф.
20.00, 23.00, 2.00 Фабрыка ўцёкаў.
21.00, 0.00, 3.00 Асвенцім.
22.00, 1.00 З пункту гледжання навукі.

TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 21.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Па чыгунках Швейцарыі.
7.00 Парад руж.
8.00, 4.30 ФотаДаследчыкі.
8.30, 12.00, 19.30, 0.30 Пра галоўнае.
9.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
11.00 Бяссграшныя падарожнікі.
12.30 Галівуд і вінаград.
13.00 Раскошныя месцы адпачынку.
13.30 Прагны вандроўнік.
15.00 Падарожжы па месцах вінаробства.
17.00 Паглядзець за 48 гадзін.
17.30 Па маляўнічых дарогах.
18.00, 23.00 Кулінарная Азія.
19.00, 0.00 Падарожжы вакол свету.
20.00, 1.00 Круіз за паўночным ззяннем.
22.00, 3.00 Сусветная адысея Джуліяна і Камілы.
24.00 Даведнік для шукальнікаў прыгод.

ANIMAL PLANET

7.00 «Разбуральнікі стэрэатыпаў».
7.25 Маёнтак сурыкатаў.
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.40, 1.40 Дэніел і нашы коткі.
9.35 Палі звярыных бітваў.
10.00 Уводзіны ў катаводства.
10.55 «Малпіна жыццё».
11.20 «Ветэрынары на маршы».
11.50 «Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл».
12.45 Ветэрынары-стажоры.
13.10 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
13.40 Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
14.35, 20.10 Перакладчык з сабачай.
15.30 «Самыя нясцерпныя ручныя жывёлы Брытаніі».
16.25 Уводзіны ў сабаказнаўства.
17.20 Уводзіны ў катаводства.
18.15 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
19.10 Паляўнічы на яд.
21.05 «Джунглі».
22.00 Кітовыя войны.
22.55 Стварэнні ў тваім кашмары.
23.50, 4.25 Паветраныя скіўіцы.
0.45, 2.35, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
3.30 Я выжыў.
6.10 Аддзел па абароне жывёл.
6.35 Здабыча драпежніка.

EUROSPORT

9.30 Вось гэта дзіва!!!
9.45 Марафон. Берлін.
12.30, 16.30 Супербайк. Чэмпіянат свету.
14.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
15.00, 19.00, 1.45 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
17.30, 20.45 Снукер. Адкрыты чэмпіянат свету.
20.30, 1.30 Мотаспартыўны часопіс.
1.00 Ралі. Серыя IRC.

MTV

5.00, 0.35 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.40 Даступны экстрым.
9.10 Котасабака.
9.35 «Крутыя бабры».
10.00 «Губка Боб».
10.55 Наступны.
11.45 Тачку на пракачку.
12.35 «True Hollywood Story».
13.30 Трэндзі.
14.00 News блок Weekly.
14.30 Ікона відэагульняў.
15.00 КінаЧарт.
15.30 «13 кіналаж».
16.00, 21.00 American Idol.
17.00 «MTV Special».
18.00 «Папялушка 2:0».
19.00 «Зоркі на далоні».
20.00 «Пакаленне MTV. Мы любім 90-я».
22.00 Каралі танцпляцоўкі.
22.55 «Паўднёвы парк».
23.45 Зорны бой насмерць.

ІНТЭР+

7.00 Бокс. Бурсак — Вера.
8.15 Украінская топ-дваццатка.
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.00 Украіна, уставай!
10.30, 22.15 Маст. фільм «Увесь свет у вачах тваіх».
11.35 Маст. фільм «Каралі і капуста».
14.05, 6.20 Тыдзень моды.
14.35 Конкурс «Міс Украіна-2010».
15.55 Мюзікл «Казакі».
18.00, 1.05 Футбол. Прэм'ер-ліга Украіны.
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 3.45 Маст. фільм «Дрэнь».
23.20 Скептык.
23.50 Гульні патрыётаў.

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

17.55 ФІЛЬМ ДНЯ

«АРТЫСТКА» (РАСІЯ, 2007 г.)

Ганна працуе ў тэатры актрысай, але ёй дастаюцца ўсяго толькі другарадныя ролі, ды і на асабістым фронце не ўсё ў парадку. У адзін цудоўны дзень Ганна, якая знаходзіцца ў чарговы раз у гасцях у лепшай сяброўкі, знаёміцца з аднакласнікам яе мужа, вядомым навукоўцам. І ўзнікае паміж імі пяшчотнае пачуццё. А неўзабаве і роля, аб якой марыла Ганна, з'явілася.

Рэжысёр — Станіслаў Гаварухін. **У ролях:** Яўгенія Дабравольская, Аляксандр Абдулаў, Дзмітрый Пяўцоў, Марыя Аронава, Юрый Сцяпанаў, Міхаіл Яфрэмаў.

Тэледоктар ЦЯРЭШЧАНКА:

«ЛЕПШ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ Ў ЛЕС, ЧЫМ НА МЕРСЕДЭСЕ Ў БАЛЬНІЦУ»

КОЖНЫ тыдзень, у нядзелю, гледачы тэлеканала ЛАД спасцігаюць «Лячэбныя таямніцы» разам з доктарам Цярэшчанкам. А ці ёсць асабістыя таямніцы ў самага тэлевізійнага ўрача краіны, як ён ставіцца да народнай медыцыны і што думае пра сучасную моладзь — усё гэта ўмясцілася ў двухгадзіннай размове. Толькі ў кампаніі з Аляксандрам Сяргеевічам час ляціць непрыкметна. Інтэлектуал і нейрахірург, у яго есць свой погляд на любыя тэмы — ад «класавай барацьбы» да начных клубаў, пры гэтым перамяшчаецца з аднаго месца ў другое з хуткасцю ветру. Сустрэліся мы ў адной са сталічных кавярняў, потым тэрмінова памчаліся на студыю, па дарозе заскочылі яшчэ па справах, тут знянацку аб'явіліся тэлевізійнікі, і ўсё гэта адбывалася, заўважце, у другой палове дня. Хацелася сказаць: «Доктар, спыніцеся і дайце перадыхнуць». Але спыняцца не сталі. Яго жыццё — гэта пастаянная праца над сабой, удасканальванне і ажыццяўленне самых смелых мараў.

Жыццё прафесіянальнае

— Напэўна, такі напружаны графік трываць можа не кожны. Калі стамляецеся, як прыходзіце ў форму?

— Калі я стамляюся, то еду ў Вільнюс выпіць з сябрамі кубак кавы, каб «памяняць візуальны шэраг», ці гляджу любімы фільм. Увогуле, ёсць шмат розных формаў інтэлектуальнага і фізічнага адпачынку. Гэта і музеі, і тэатр, і кіно, і кніга. Ёсць плаванне, тэніс, веласіпед. Проста прагулка па парку. Адна з маіх праграм праходзіла пад дэвізам: **«Лепш на веласіпедзе ў лес, чым на мерседэсе ў бальніцу»**. Імкненне да здароўя патрабуе перш-наперш жадання.

— А здаровы лад жыцця паводле доктара Цярэшчакі, гэта што?

— Па-першае, гэта маё добразычлівае стаўленне да ўсіх, хто жыве побач. Пазітыўна і творча гляджу на свет. Калі мы вядзём размову пра намеры, то яны таксама павінны быць творчымі. Уявіце, калі нас без малога 10 мільёнаў, і кожны дзень мы будзем ствараць штосьці пазітыўнае — усмешку, добры прыём пацыента, нават гайку, але лепшую, чым японскую, — тады і жыццё зменіцца. Час ад часу мы разумеем здаровы лад жыцця вельмі прымітыўна. Калі доктар угаворвае пацыента з лёгачным захворваннем не паліць, дзяржава марнуе на яго лячэнне грошы, а ён, ужо лежачы на аперацыйным стале, кажа, што курэнне — гэта яго адзіная асалода ў жыцці, то нічога добрага ў яго жыцці не атрымаецца. Калі ён курыць, а ў яго ёсць захворванне, звязанае з курэннем, няхай плаціць дзяржаве за свой капрыз, за лекі. І доктар не павінен угаворваць пацыента жыць правільна, ён можа толькі растлумачыць, што трэба, а што нельга. Патрэбна адказнасць пацыента за сваё жыццё і здароўе.

— Хто вы ў першую чаргу — доктар ці тэлевядучы?

— На першым месцы я заўсёды доктар. Зараз займаюся папулярызацыяй сваіх ведаў і ведаў паважаных калег. Мая звышзадача — данесці веды пра чалавека да максімальнай колькасці людзей, вярнуць увагу да саміх сябе. Часам людзі пра свае аўтамабілі раскажуць больш, чым пра саміх сябе. Крый божа прапусціць час замены масла ці заліць не той бензін. Калі мы з машынай зробім нешта не так, то машына не паедзе. А да свайго арганізма можна ставіцца не так уважліва. Толькі калі ён спыняецца, тады пачынаем думаць і... не бяжым да доктара.

— Але знайсці ўрача, які табе дапаможа, таксама складана.

— Вы разглядаеце ўрача як бензакалонку, якая павінна выдаць вам паліва тут і адразу. Здароўе патрэбна перш-наперш не доктару, а табе самому. Прэтэнзій не павінна быць. Не факт, што ты прыйшоў, і ўрач з першага разу паставіць дыягназ і скажа, як гэта лячыць. Свайго доктара трэба знайсці, а яшчэ паважаць і любіць!

У сваёй праграме я імкнуся паказаць, што беларускія ўрачы — прафесіяналы еўрапейскага ўзроўню. Нядаўна праходзіў сусветны кангрэс траўматолагаў у Швецыі. З 500 дакладаў 16 было беларускіх (!), 9 рускіх і 1 украінскі. Уявіце, які ўзровень у айчынных спецыялістаў! Можна сказаць, што нашы ўрачы прывезлі 16 алімпійскіх медалёў.

— Тым не менш прэстыж прафесіі за апошнія гады пахіснуўся. З чым гэта звязана?

— Урачы ва ўсе часы былі элітай, не толькі ў медыцыне — элітай разумовай, ментальнай, грамадзянскай. Зараз жа праяўляецца больш утылітарны аспект. Патрэбны проста дактары, якія штосьці будуць рабіць і ўмець. Я думаю, што гэта часовая з'ява. Добры доктар, як і праграміст ці мастак, — гэты штучны прадукт. Паколькі нашы прэтэнзіі да свайго здароўя растуць, значыць, патрэба ў добрых дактарах будзе вышэй і вышэй з кожным годам.

— Вашу праграму можна лічыць якасным інтэлектуальным прадуктам?

— Мне не сорамна ні за адну праграму, якую выпусціў у эфір. Можа, бывае калі-нікалі няёмка за тэхнічную частку, але не за змест. Тым больш што з гэтага сезона мы пачынаем здымаць праграму ў фармаце HD. Гэта вялікі крок наперад. Гэта магчымасць развіцця не толькі нашага калектыву, але і развіццё тэлебачання ўвогуле.

Жыццё асабістае

— Мне падалося, што вы патрабавальны чалавек да іншых і ў першую чаргу да сябе.

— Не разумею другасных людзей. Другасных у сэнсе мэтанакіравання, жаданняў. Паважаю, падтрымліваю зносіны з лепшымі. Калі перад табой чужы чалавек, на бытавым узроўні, ты ў прынцыпе не можаш ад яго патрабаваць шмат, мы розныя, з рознымі поглядамі на адноўкавыя рэчы. Патрабавальным трэба быць да сваіх родных і блізкіх, людзей, лёс якіх залежыць ад цябе.

— Дарэчы, у вас дзве дачкі. Яны таксама пойдуць ці ўжо ідуць па слядах бацькі?

— Старэйшая вучыцца ў маім любімым універсітэце. Яна стаматолаг, як і маці. Вельмі паспяховая асоба, і я ў яе веру. А малодшая, магчыма, будзе займацца журналістыкай, тэлебачаннем. Яна ў творчых пошуках. Цяжкіх, але неабходных.

— Як вы пазнаёміліся са сваёй жонкай?

— Выпадкова сустрэліся, а мелі стасункі невыпадкова. Яна праявіла мужнасць у сяброўстве са мной. Памятаю, як мая будучая жонка паехала з нашай мужчынскай кампаніяй катацца на горных лыжах. Яна не ведала, што такое горныя лыжы, у тыя часы іх нават па тэлевізары не паказвалі. Мы паехалі ў Карпаты і там яна стала на горныя лыжы і паехала. Я ёй вельмі ўдзячны, таму што жыць са мной, чалавекам, які пастаянна рухаецца наперад, вельмі складана.

— У прынцыпе, ваша імкненне да творчасці, развіцця і няспыннага руху — заканамерная з'ява. Ваш бацька быў членам Саюза журналістаў СССР, вы сябравалі з Быкавым і Караткевічам. Пабываўшы ў кампаніі такіх людзей, цяжка застацца не творцам.

— Я ўдзячны свайму бацьку за падоранае аналітычнае мысленне. Быкаў — гэта другі чалавек пасля майго бацькі, з якім у мяне былі такія даверлівыя адносіны. Нас пазнаёміў наш агульны сябар Яўген Коктыш — легенда беларускай фотажурналістыкі. Памятаю, калі мы наведваліся да Быкавых, то Ірына Міхайлаўна, яго жонка, мяне заўсёды частавала сырамі, якія прывозіў Васіль Уладзіміравіч з замежжа. А Караткевіч нават ляжаў у клініцы, дзе я працаваў. Уладзімір Сямёнавіч хварэў, таму нашыя гутаркі былі больш медыцынскія, але не менш цікавыя. Шмат чаго было цікавага і памятнага. Размовы з Алесем Адамовічам — гэта эпоха ў развіцці светапогляду майго і маіх сяброў. Разам з маладымі мастакамі — Славуком, Зінкевічам, Ганяевым, Селешчуком — гулялі ў футбол, у фуфайках, не гламурна, штурмавалі Карпаты, наведвалі выставы ў Вільні, у Маскве. Працавалі і працавалі... І ў кожнага з нас з тых часоў была свая, але і агульная мэта — стаць ЧАЛАВЕКАМ.

Вольга КОРШУН.

Карысна ведаць

СУПЕРГЕРОІ ПАДАЮЦЬ ДРЭННЫ ПРЫКЛАД

СУЧАСНЫЯ супергероі з кінафільмаў прапагандуюць помсту і гвалт, а не дабрыню і здаровы лад жыцця, лічаць псіхолагі з Універсітэта Масачусэтса ў ЗША. У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, сённяшнія героі кінафільмаў агрэсіўныя, эгаістычныя і не могуць быць станоўчым прыкладам для дзяцей.

Каб зразумець, які вобраз навязваюць сучасныя фільмы, псіхолагі апыталі 674 амерыканцаў ва ўзросце ад 4 да 18 гадоў і высветлілі, што яны чыталі і глядзелі ў кіно і па тэлевізары апошнім часам.

Аказалася, што сучасныя супергероі — больш не ўзор мужнасці, а «гульцы» і «лайдакі». На думку даследчыкаў, гэта хлопцы, якія нават не спрабуюць «захоўваць твар». Прычым дзеці шчыра лічаць, што нават калі яны не могуць стаць супергероем, быць лайдаком, як іх любімыя персанажы, не перашкаджае нішто. Гэта не дае ім не толькі вучыцца, але і займацца спортам, правільна харчавацца і клапаціцца пра ўласнае здароўе. Бо, як лічаць псіхолагі, цяперашнія супергероі здаровы лад жыцця не прапагандуюць.

У той жа час, згодна з іншымі даследаваннямі, дзяўчынкі ў дзяцінстве часта выбіраюць аб'ектам для пераймання залішне стройных мультыплікацыйных прынцэс, рызыкуючы ў падлеткавым узросце займець парушэнне харчовых паводзінаў. Затое героі кніг, якія вядуць здаровы лад жыцця, на дзяўчынак уплываюць станоўча.

Выснова? Менш тэлевізара, больш прагулак — можна з кнігай.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Сам сабе псіхолаг

РЭПЛІКІ-ТАБУ ДЛЯ ПАДНАЧАЛЕНЫХ

СТАЛІ вядомыя фразы, якія не рэкамендуецца гаварыць начальніку. Любое выказванне з наступнага пераліку здольнае моцна падсапсаваць імідж супрацоўніка ў вачах яго боса.

Рэпліка **«гэта не ўваходзіць у мае абавязкі»** можа здацца занадта дзёрзкай. Ужываючы так